# Нашы юбіляры

## ВОЛЬГА ВАСІЛЬЕЎНА КАЗЛОВА
## (ДА 60-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)



Споўнілася 60 год з дня нараджэння кандыдата філалагічных навук, дацэнта, Заслужанага работніка вышэйшай школы БССР Вольгі Васільеўны Казловай.

Вось ужо сорак год яе лёс звязаны з БДУ імя У. І. Леніна, з філалагічным факультэтам, які Вольга Васільеўна скончыла ў 1948 годзе, дзе вучылася ў аспірантуры і абараніла кандыдацкую дысертацыю, а ў 1952 годзе ўступіла ў члены КПСС.

Дванаццаць гадоў В. В. Казлова ўзначальвала кафедру беларускай літаратуры. За гэтыя гады членамі кафедры абноўлены праграмы, выдадзены і перавыдадзены падручнікі па гісторыі беларускай дарэвалюцыйнай і савецкай літаратуры, беларускай дзіцячай літаратуры, шматлікія манаграфіі.

З даследаваннем скарбаў беларускай літаратуры звязаны асноўны профіль навуковай работы В. В. Казловай; яе шматлікія публікацыі прысвечаны праблемам вывучэння творчасці Янкі Купалы, Якуба Коласа, Пятруся Броўкі, Міхася Лынькова, Янкі Брыля. Яна—адзін з аўтараў двухтомнай гісторыі беларускай савецкай літаратуры, аўтар метадычных дапаможнікаў па напісанню курсавых і дыпломных работ. В. В. Казлова плённа працуе над пытаннямі методыкі выкладання ў ВНУ, яна ўдзельніца шматлікіх міжнародных, усесаюзных, рэспубліканскіх навуковых канферэнцый.

Арганізатарскія здольнасці В. В. Казловай выявіліся яшчэ тады, калі яна, не шкадуючы часу, працавала куратарам студэнцкай групы, была ў складзе прафбюро, партбюро філфака, парткома і прафкома БДУ. Сёння В. В. Казлова з'яўляецца членам рэспубліканскага метадычнага аб'яднання выкладчыкаў беларускай літаратуры ВНУ, членам каардынацыйнага савета па пытаннях літаратуры пры АН БССР, членам рэспубліканскага праўлення «Веды», намеснікам старшыні секцыі літаратурнага тэатра і мастацкага чытання грамадскага мастацкага савета Міністэрства культуры БССР, членам рэдкалегіі «Весніка БДУ», членам вучоных саветаў БДУ імя У. І. Леніна, філалагічнага факультэта, музея Янкі Купалы.

Навукова-педагагічная і грамадская дзейнасць В. В. Казловай адзначана шматлікімі ўзнагародамі: медалямі «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», «За працоўную доблесць», «Ветэран працы», трыма ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Ёй прысвоена ганаровае званне Заслужанага работніка вышэйшай школы БССР, ударніка камуністычнай працы. Каштоўнай узнагародай лічыць натхнёная працаўніца і тыя лісты, што дасылаюць ёй былыя выхаванцы, настаўнікі, рабочыя, калгаснікі, ветэраны вайны і працы. У іх словы ўдзячнасці за чалавечнасць, партыйную прынцыповасць, падтрымку.

Калектыў кафедры беларускай літаратуры, калегі і вучні сардэчна віншуюць Вольгу Васільеўну з юбілеем і жадаюць ёй моцнага здароўя, шчасця, новых творчых поспехаў.